# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

# Германія і Савецкі Саюз, 1939

Урок
90 хвілін

Дадатковы матэрыял

Першакрыніцы

# Першакрыніцы (Германія і Савецкі Саюз)

## Дагавор аб ненападзенні паміж Германіяй і Савецкім Саюзам

Урад Германіі і Урад СССР

Кіраваныя жаданнем умацавання міру паміж Германіяй і СССР і зыходзячы з асноўных палажэнняў дагавора аб нейтралітэце, заключанага паміж СССР і Германіяй у красавіку 1926 года, прыйшлі да наступнага пагаднення:

**Артыкул I**

Абодва Дамоўныя Бакі абавязаны ўстрымлівацца ад усякага гвалту, ад усякага агрэсіўнага дзеяння і ўсякага нападу ў адносінах адзін да аднаго як асобна, так і сумесна з іншымі дзяржавамі.

**Артыкул II**

У выпадку, калі адзін з Дамоўных Бакоў акажацца аб’ектам ваенных дзеянняў з боку трэцяй дзяржавы, іншы Дамоўны Бок не будзе падтрымліваць ні ў якой форме гэтую дзяржаву.

**Артыкул III**

Урады абодвух Дамоўных Бакоў застануцца ў будучыні ў кантакце адзін з адным для кансультацыі, каб інфармаваць адзін аднаго аб пытаннях, якія закранаюць іх агульныя інтарэсы.

**Артыкул IV**

Ніводны з Дамоўных Бакоў не будзе ўдзельнічаць у якой-небудзь групоўцы дзяржаў, якая прама ці ўскосна накіраваная супраць іншага боку.

**Артыкул V**

У выпадку ўзнікнення спрэчак або канфліктаў паміж Дамоўнымі Бакамі па пытаннях таго ці іншага роду, абодва бакі будуць вырашаць гэтыя спрэчкі або канфлікты выключна мірным шляхам у парадку прыязнага абмену думкамі або ў патрэбных выпадках шляхам стварэння камісій па ўрэгуляванні канфлікту.

**Артыкул VI**

Гэты дагавор заключаецца тэрмінам на дзесяць гадоў з тым, што, калі адзін з Дамоўных Бакоў не дэнансуе яго за год да заканчэння тэрміну, тэрмін дзеяння дагавора будзе лічыцца аўтаматычна падоўжаным на наступныя пяць гадоў.

**Артыкул VII**

Гэты дагавор падлягае ратыфікацыі ў магчыма кароткі тэрмін. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі павінен адбыцца ў Берліне. Дагавор уступае ў сілу неадкладна пасля яго падпісання.

## Сакрэтны дадатковы пратаколI

Пры падпісанні дамовы аб ненападзенні паміж Германіяй і Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ніжэйпадпісаныя ўпаўнаважаныя абодвух бакоў абмеркавалі ў строга канфідэнцыйным парадку пытанне аб размежаванні сфер узаемных інтарэсаў ва Усходняй Еўропе. Гэтае абмеркаванне прывяло да ніжэйзгаданага выніку:

**Артыкул I**

У выпадку тэрытарыяльна-палітычнага пераўладкавання абласцей, якія ўваходзяць у склад Прыбалтыйскіх дзяржаў (Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Літва), паўночная граніца Літвы адначасова з'яўляецца мяжой сфер інтарэсаў Германіі і СССР. Пры гэтым інтарэсы Літвы ў адносінах да Віленскай вобласці прызнаюцца абодвума бакамі.

**Артыкул II**

У выпадку тэрытарыяльна-палітычнага пераўладкавання абласцей, якія ўваходзяць у склад Польскай Дзяржавы, мяжа сфер інтарэсаў Германіі і СССР будзе прыблізна праходзіць па лініі рэк Нарава, Віслы і Сана.
Пытанне, ці з'яўляецца ва ўзаемных інтарэсах пажаданым захаванне незалежнай Польскай Дзяржавы і якія будуць межы гэтай дзяржавы, можа быць канчаткова высветлена толькі на працягу далейшага палітычнага развіцця.
Ва ўсякім выпадку, абодва Урады будуць вырашаць гэтае пытанне ў парадку прыязнай ўзаемнай згоды.

**Артыкул III**

Датычна паўднёвага ўсходу Еўропы з савецкага боку падкрэсліваецца цікавасць СССР да Бесарабіі. З германскага боку заяўляецца аб яе поўнай палітычнай незацікаўленасці ў гэтых абласцях.

**Артыкул IV**

Гэты пратакол будзе захоўвацца абодвума бакамі ў строгім сакрэце.

Масква, 23 Жніўня 1939 г.
За Урад Германіі фон Рыбентроп
Па ўпаўнаважанні Урада СССР В. Молатаў

455 слоў
Крыніца: https://en.wikisource.org/wiki/Molotov%E2%80%93Ribbentrop_Pact#Secret_Additional_Protocol, Дата апошняга наведвання: 11.01.2021 г.